*Наталля Кучмель*

# Імгненні

*Вершы*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2005

KAMUNIKAT.org

KAMUNKAT.org



* * *

Стосам блытаных ліній,
Быццам ніці з асновы, —
Залатое на сінім
Голле ў вечар вясновы.

І ў дрыготкіх глыбінях
Шэрых воч тваіх — тое:
Залатое на сінім.
Залатое на сінім.
Залатое…

KAMUNIKAT.org

* * *

Не кідай, будзь са мной,
жыві, пачуцце-нежыць:
Хацець — што не маё,
кахаць — што не належыць:
Вусоў дзяціны пух, валос закрут цяжкі
І дырыжорскі рух дзявочае рукі.

* * *

Неба лікуе,
пацямнелі брады;
Чайкі святкуюць
вызваленне вады.
І на шклёным балконе,
дзе пануе пыльныя цьма,
Для інжыра ў вазоне
скончылася зіма.

* * *

Сатлелі травы нашага юнацтва,
І кветкам ад марозаў не падняцца.
Ды адчуванне дзіўнае палёгкі:
Жыві, далёкі.

* * *

Першая кропля па выпуклым шкле
Рассыпалася на злёце.
Як хлопец у цельніку — клён у святле
Машыны на развароце.

Рэзкія плямы паўзверх зямлі
Разбіты ліхтар кідае...
Хто яго ведае — дзе, калі
Аднойчы тое згадаю?

* * *

Дзень паўпрылёг на горад і раку
Празрыстым, цёплым,
быццам летнім, целам.
Павольна падаўшы, не шамацела
Лісціна, абмінаючы руку.

І на ваду, схіліўшыся, з маста
Дзівіўся нехта — хворы ці то п'яны...
Згасаў палын, разліты ў донцы шклянак
Вачэй пад колер мокрага ліста.

* * *

Сцежкаю да прыпынку
Праз зарослы язмінам двор
Хлопец нясе дзяўчынку...
І думае — што да зор.

Лёгка, нібы націнку,
Праз хвіліны — як праз гады,
Хлопец узняў дзяўчынку.
І думае — назаўжды...

* * *

Дымам на веі — клеіцца стома.
Чуць, як гаворыць з ветрам салома.
З ветрам — салома, з кроплямі — голле,
З сэрцам нявольным — вольная воля.
— Йдзі сюды, сэрца, — дам табе крылы:
Лётай, кружыся, дзе табе міла.
Будзе халодна, будзе й галодна,
Але ж затое — шчасна, свабодна!
— Позна мне, цяжка, — сэрца казала. —
Чорнае лоззе вены працяла.
Чорнае лоззе, мокрае лісце —
Не адарвацца. Вось бы калісьці...

* * *

Ноч пяе дыханнем тваім.
Я яго чую — і ноч пяе.

Ноч пяе золатам кончыкаў вей.
Я іх бачу — і ноч пяе.

Ноч пяе дакрананнем рукі,
Далонню ў далоні, крокам у крок.
Паветра згушчаецца — не ўдыхнуць,
І з сэрца капае цёплы сок.

* * *

Ліпнёвы надвячорак прыкідваецца днём.
Няма куды спяшацца.
Ўсе дома. Маскі здзеты.
Каханы хлопчык мой, нібыта кацянё.
Аблізвае вяршкі з малочнага пакета.

* * *

Вечар пахне лісцём і пылам.
Котка злезла з акна пад'езда,
Валюхаючыся, пайшла.
Душна, быццам між сценак вазы:
Атачае дамы, здаецца,
Тонкі пласт залатога шкла.

* * *

У любой цеплыні
на хвіліну здарыцца змрочна,
Цверазеўшы, спіной адчуць
пад шпалерамі — мур.
Маленькі лемур, у цябе вялізныя вочы;
Прыпадзі да маіх грудзей, маленькі лемур.

KAMUNIKAT.org

## *Плён*

Мята, мята пры балоце,
Рута пры рацэ.
Як пук жыта — жмут мелодый
Пры адной руцэ
Прыхінёны; а другая —
Жоўтае, як звон,
Сэрца спелае трымае;
Белы мёд з яго сцякае
Проста на далонь.

KAMUNIKAT.org

* * *

Студня на выспе пяску
Белым прысыпана снегам.
Памяць аб тонкім, гарачым
Целе тваім.

Памяць аб веях —
Шорсткіх, як снег,
            што зрываецца з даху пад ветрам,
Лёгкіх, як снег,
              што сядае на твары і кроны.
Дымчаты снег.

Памяць аб вуснах —
Вабных, як позні вішні
                              ў лістоце калянай,
Прагных, як быццам пчала,
                              што аблізвае спелы
Вішанны сок.



KAMUNIKAT.org

* * *

Ты багатай зрабіў мяне.
Даравaў мне срэбра і злота,
Перлы, лалы і дыяменты.
Тыя скарбы заўжды са мной:
Срэбра ў пасмах вакол чала;
Злота зор — скрозь мокрыя веі;
Лалы сораму, жалю, гневу,
Дыяменты слёз развітальных
І ў халодны дзень прад змярканнем
Перлы кропель на сумным шкле.

* * *

Паблякла неба, звітае смутой.
Бязважкімі гуляе прыпаламі
Ліпнёвы вецер: каля губ Яго
Сівы матыль трапечацца крыламі.

Як горача! Паволі нікне дзень.
І пазіраюць з моста дзве дзяўчыны
На мноства белых кропак па вадзе —
Як быццам бы па ягадзе рабіны.

* * *

плыў дождж над горадам
цяжкі і нізкі быццам дым
і голле гордае
само хілілася прад ім
так за гадзінаю
гадзіна коціцца ў пакой
гром кропляў рынаю —
курантаў бой

плыў дождж над горадам
звісаў завесаю вады
як мяккім голасам
ахутваў змоўклыя сады
і не ўскалочана
у палісадзе між вяргінь
пад колер воч тваіх
стаяла стынь

* * *

Стрыжоў і ластавак мые
Неба водаварот.
Шыпшыны губы тугія
Сцялі ружовы рот.
Паволі ноч наступае,
І ў ёй прасвету няма...
За здраду найгорш карае
Жанчына сябе сама.

* * *

Я за цябе старэй — на той спакой,
Які бывае, калі ўсё разгубіш
І не кахаеш, а спакойна любіш,
Не забываючыся выгады сваёй.
Я за цябе старэй — на той спакой.

* * *

Ў акне дзявочай спальні
Гарыць, не міргне свечка.
Кахаць не развучыцца.
А ўнізе — вецер, слота.
Пажоўклых лісцяў плямы.
Няма прытулка сэрцу.
Каханак на гадзіннік
Глядзіць, затым — у цемру.
Кахаць не развучыцца.
Кот мокры і бліщчасты
Хаваецца ў пад'ездзе.
Няма прытулка сэрцу.
У сне, прад нараджэннем,
Шаволіцца зародак.
Кахаць не развучыцца.
Штоночы ў адзіноце
Стары чакае смерці.
Няма прытулка сэрцу.

* * *

Скупое сонца п'юць бакамі гмахі,
І смешны снег аблёг зямлю і дахі —
Як семяно: пласт пуху па вярху
І кругленькае, цвёрдае — ў пуху.

І не назваць, што больш было б вясеннім,
Чым гэты снег, падобны на насенне,
І сонца, што, як котка на страсе,
Аж надта годна галаву нясе.

Але ўжо прагрымелі кроплі сцёкам.
І твой пакой — абдымкаў нашых кокан,
Спусцелы кут задушных таямніц —
Асветлен скрозь прарэзы аканіц.

* * *

Ляніва, быццам адэсіты, вып'юць кавы
І пойдуць блындацца па горадзе
без справы —
Два даўганогія, пад сонцам, за руку.
І ветрык,
што ў дрымотных пошуках чагосьці
На даляглядзе, як падушкі, хмары мосціць,
Не пашаволіць разамлелую раку;

Бо на адно дастане сіл —
даткненнем гібкім
Сушыць нагі маленькай мокрыя адбіткі
На шэрым покрыве бетоннай паласы
І спрабаваць спатоліць вялае тамленне,
Яе спадніцай абвіваючы калені.
Яму разбэрсаўшы на вочы валасы.

* * *

Праполка... Двухтыднёвыя дажджы
Дзяляну марнатраўем затапілі.
Паўсюль, не вылучаючы ні град,
Ні баразён,— адною злітнай хваляй
Курчавіцца і бухне зелянота.
Мелісы пах. Мяшаючыся з пахам
Парэчкі і зямлі, ён кліча — жыць!
Ён кліча — жыць! Ён кліча —
шчасным быць,
На дробязі не зварачаць увагі.
Не гледзіш? Што ж. Будзь вольны.
Бог з табой.
Жыві, як можаш. Я жыву — як хочу!
Таму што ведаю цяпер, як трэба,
Таму што падаюцца пад рукамі
Макрыцы ніцістыя карані,
І дыхае слабенькая меліса,
У свет шырокі гледзячы з адвагай,
І між кустоў парэчкі — самасея,
Хоць мокрая, ды гордая паставай
Сарана яркай барваю гарыць.

* * *

*Паводле сюжэтаў*
*«Тысячы і адной ночы»*

— Здурнела! Сорам на вачах губляеш!
Пагардліва зірнуўшы спадылба,
Ўсясветнаму цару ты адмаўляеш
І да грудзей штомоцы прыхінаеш
Нахабнага і брыдкага раба!
І цар, адрынуты, абагаўляе
Тваю між смецця знойдзеную рэч,
А раб каравы твар свой прыкрывае
Ад пацалункаў і цябе піхае,
Нібы свінню: «Пайшла, пачвара, прэч!»
— О той, хто загаворвае сурокі,
Дапамажы, бо звяну, як трава:
Самааддданы, юны, яснавокі,
Мне цар не мілы; нічые папрокі
Не дапамогуць: чую толькі крокі
Карослівага чорнага раба.

* * *

Май. Дождж ішоў. Цяжкі і вогкі пах
Цяжкіх і вогкіх выпарэнняў бэзу.
Асфальтам заліваны чорны шлях
Блішчыць спіной, як мокрае жалеза,
І на ільсністай, маслістай спіне
Ў бяздумнасць і спакой нясе мяне.

* * *

Неба ў бляску сляпучым стыгне,
Жоўтым вокны шкліць.
Без цябе пражыўшы тры тыдні.
Так і звыкну жыць.

Але ў вечар, ветрам напяты
Над ламаным грэбнем дамоў,
Тонкі твар, бы з іконы зняты,
Узгадаю зноў.

Што ты? Дзе ты? Месяц замглёны
Крэпне між аблок.
У завулку блукальнік сонны
Прыцішае крок.

* * *

На могілках старых
з-пад голых вербаў ніцых
Відаць, што не гарыць ні ў храме,
ні ў капліцы
Святло; і рад магіл, на стомлены пагляд,
Так мірны, як нібы дзіцячых ложкаў рад.
Парадак іх маўчыць аб сне, а не аб смерці.
І хочацца запхаць пад белы камень сэрца
Дый так далей пайсці — каб не было чаму
Ні рвацца, ні цярпець пякучую думу,
Ані перажываць бязлюдства, безграшоўе,
Пакуты за любоў, чыёсьці безгалоўе...
Йсці стылай, ледзяной,
цягнуць бязгучны спеў
І тоненькім кійком збіваць лістоту з дрэў.

* * *

Холад чаромхі, туману, раскрытае рамы;
Холадам вее салоўкавы шчокат таксама
З купаў надрэчных кустоў.

Сцюжа бяссонных стагоддзяў пустога чакання;
Пары, якой на марозе стаецца дыханне;
Сцюжа сівых валасоў.

Іскры сваяцтва, любові, сяброўстваў цяпельцы
Не затрымаюць хвіліны, ў каторую ў сэрца
Зойдзе льдзяная ігла.

Што ж мы,
                як толькі разблыталі кокан малечы,
Выспелі, сталі сабою, — за век чалавечы
Маем так мала цяпла?

* * *

Ліпень. Здымкі начныя.
Камароў над дрыгвою бяссонне
Штохвіліны па шкле асвятляльнікаў
цельцамі б'е.
У кустах вербалозу
захліпаецца соладка конік
І расою паволі
набракаюць красоўкі твае.

Неба, бледнае з захаду,—
ў шнарах аблок вечаровых,
І далёкае, дробнае полымя ўнізе дрыжыць.
Як ты мякка ступаеш —
нібы госць на зямлі выпадковы —
І дрыгве гэтай гідлай
сцеражэшся балюча зрабіць.

Ты вялікі, як неба,
і маленькі — бы мне па далонях
Даступаеш да сэрца;
ціхі гук кінакамера ўе.
Хай штоночы між лоззя
захліпаўся бы соладка конік
І траву далікатна кранал і красоўкі твае.

* * *

Ад мастака — партрэту.
Сонны дождж
Паткнецца ў шкло —
Памыслю пра цябе я.
Каханне — не адзіная ідэя,
Дзеля якое варта йсці пад нож.

Але калі па скошаным ілбе
Маёй магільнай выспы
Дождж заскача,
То фарбы — жыцьмуць.
Можа, тым аддзячу
Сусвету і табе.

* * *

Сон стане сродкам ізноў
як наяве, ўбачыць
Мужнасць разлатых броў,
а пагляд — дзіцячы.
Столькі пражыўшы гадоў — цяпер разумею
Цалкам значэнне слоў пра «праменні веяў»;
Толькі цяпер вырастае з-пад сэрца згода
З вобразам казак усходніх:
«Вачэй маіх прахалода...»

* * *

Мяне не слухаюцца рыфмы.
І верш — той нудны гук, калі
Тужліва ўслед сапраўдным рыпнуць
Калодзежныя жураўлі.

Паперы — мо на трыццаць столак,
Ды аднаго няма на ёй:
Як вылузнуўся з ночы золак
І раскрываецца зарой.

* * *

З ціхім шасценнем, бы кнігі старонкі.
Вецер шаволіць лістоты руду.
Ў небе бязвоблачным месячык тонкі
Нізка ляжыць — запірае ваду.

Так бы прасіцца ў любові злашчаснай
Словамі песні, пачутай не раз:
— Месяц мой звонкі, о месячык ясны,
Ой, не свяці ты на той пералаз!

* * *

Звечарэла. Сонна ў пакоі.
Пахне ліпамі з-за сцяны.
Тут знайшлі дэфектыўных двое
Чалавека адно ў адным.

Мы калені падоймем горкай
І смычок пакладзём ля ног.
Падбароддзем мяккім, нягордым
Увапрэмся ў скрыпічны бок.

Мне не страшна цяпер зламацца,
Не карціць адваёўваць штось.
Для другіх хай буду нармальнай,
Для цябе — такая, як ёсць.

## *Быў канец лютага*

Весні туман — неспатольней за жабры
Скура, здаецца, ўбірае.
Голле вугластае, як кандэлябры,
Ўскінула груша старая.

Кропля над возерам — бліcь! — і пагасла.
Так твае губы сухія
Першым дажджом, сарамліва-бясстрасна
Мне датыкаліся шыі.

KAMUNIKAT.org

* * *

Жыццё; і ў ім — хрупасткасць і надрыў,
Бо кожная сустрэча стаць магла
Апошняю. Будынак чорны брыў,
Як п'яны па дажджы; вада цякла
З яго; і дзіўным позірку было
Слабое далікатнае святло
Шчылінаў ставень — як шчылінаў вей:
Дык, значыць, дом населены людзьмі?
І гаспадар — сухі стары яўрэй
З вялізнымі дзяцінымі вачмі —
Свой смешны дзень пасоўваў па сцяне...
Здаецца, гэты дом любіў мяне.

Глыбей у шторы шылася акно,
І воды ў трубах наўзварот цяклі —
Калі, абняўшы, аднаго адно
Мы з бездані дэпрэсіі цяглі.
Успыхваючы, падаў край-крыло
Зямлі, дзе нам так добра быць магло,—
Слабы і белы, як твая рука
У поўнай цьме, на гузіку замка.

* * *

Хто б сказаў — каханне маё;
Я скажу — чаканне маё.

Хто б сказаў — ты любасць і гнеў;
Я скажу — бясконцы спадзеў.

Сцяўся ў ім, як броваў надлом,
Свет малы за жоўтым акном.

Час застыў над светам малым.
Аніштo не здарыцца ў ім —

Не скаціцца слёз раўчуку,
Не разліцца ў цішы званку.

* * *

Туман ярам, ярам-даліною...
*З народнага*

Туман ярам... Плятуцца стужкі туману
Вакол чорных хмызоў, вакол елак малых.
Але ім устыдацца тонкага стану
І празрыстых веяу тваіх.

Пералеска ўскіне сцяблы маладыя
У глухіх вільготных ярах вясной —
І падасца, быццам хлапечай шыі
Не ўтрымаць галавы буйной.

І, нібыта аскепак светлага лёду
Аплывае сэрца весняй парой.
Толькі позна — згінулі насалоды,
Толькі сцюжай цягне з яроў.

* * *

Неба весняе — ясны німб,
О горад мой;
Голле рыжае — светлы кілім
Над тваёй галавой.

Сёння рака сваю вязкую кроў,
О горад мой,
Гоніць хутчэй ад світання вятроў
Над тваёй галавой.

І падаецца — ажылі дамы,
О горад мой;
Палі скляпенні зімовай турмы
Над тваёй галавой.

KAMUNIKAT.org

* * *

Цераз якую муку вызнаем,
Чым дзячаць добрым, шчырым і адданым,
І потым — выпадковым аддаем,
Што не насмеліліся даць каханым.

І помняцца такіх спатканняў сны
Тым саладзей, што адыходзяць з ночай...
...Як лёгка з выпадковымі — яны
Запомняць нас такімі, як мы хочам.

* * *

А у Цябе няма імя.
Ніяк не зваць маю руку ці вока;
Ніяк не зваць маё дыханне, сэрца,
Але без іх — не жыць.

Ніяк не зваць
Дыханне ночы ліпеньскай без ветру
І зорку над высокаю таполяй;
Ці яксьці зваць — ды гэта неістотна:
Яны завуцца — Ты.

* * *

Сёння ў небе імжыцца
снег бялюткі, а дробны такі —
Маці Божая быццам
вытрасае мяхі з-пад мукі.

* * *

Апала лісце. Месяц лістапад
Абмёрзлыя галіны ў неба ўзняў.
Бялёсы, як падмоклы, далягляд
І насцярожаная цішыня.

* * *

Над цёплым пылам сходаў,
Над дзённаю кунегай —
Як быццам сінім мёдам
Напоенае неба.

І ў ясным дні, што ў ставе,
Плывеш малою плоткай...
— Мёд сіні не бывае?
Але глядзець — салодка.

* * *

Многа зімаў прайшло,
І шмат пракацілася вёснаў,
Але дагэтуль
Выклікае здзіўленне
Тое,
Што імем тваім
Могуць клікаць кагосьці яшчэ.

* * *

На сто дарог вакол ляжыць разбухлая зямля.
Заплыла ноч над галавой агромністае неба.
І адмяжоўвае ад іх вялізарнае голле
Маленькі свет, дзе мы з табой,
абняўшыся, сядзім.

Таполі стукаюцца між халодных, золкіх зор.
Вышэй за верхі іх
расце гарачыня абдымкаў.
І будзе час, што ў самых нас
раскрыецца бяздонне,
І стане толькі наш з табой вялікі гэты свет.

* * *

Ёсць веліч у старых закінутых мурах —
Ды сэрца паміж іх хутчэй адчуе страх.
Не так спаруды сцен,
абломы сыпкіх вокан —
Густы і пышны ўюн прываблівае вока.
Свет ясны, так і ты мае прыгожыш сны —
Гліцыніі святлом уздоўж рабой сцяны.
Спамінам аб табе — ліянаю зялёнай —
Прыкрашан грубы мур
паўсёднасці штодзённай.

* * *

А з бяроз — па адным — ападаюць лісты.
Імі ўсланы дарогі, нібы талярамі.
Позні вечар. Вагон напалову пусты.
Толькі белая-белая поўня над намі,
Ды з бяроз — па адным — ападаюць лісты.

* * *

Мокрае, шэрае неба радзімы — ды вочы
Звыклі да фарбаў няяркіх, абрысаў някідкіх.
Тут пра вясну сведчыць
                    нават не першы лісточак —
Першыя на тратуарах падсохлыя пліткі.

Дзіва, як тут, сярод гэтае стылае слоты,
Змог узрасці — на прыгоду і песню гатовы,
Моцны і гнуткі,
                    як хмелю над вокнамі сплёты,
Светлы, як хмелевы гроны
                    ў красе верасьнёвай.

* * *

Лёгкі голас, лёгкі кашаль, лёгка ў такт
Калыхаецца хусцінка на грудзях.
І вітрыны лёгка поглядам лавіць —
Не бянтэжыць, што не хопіць заплаціць.

Так, як быццам бы адкрыты ўсе шляхі,
Быццам лёгка дараваны ўсе грахі...
З мяккай гразі вецер вільгаць падабраў;
Новяць колер купы выпетраных траў.

Толькі нудна, абдзіраючы руку,
Ключ каторы раз правернецца ў замку —
Бо вясновы дзень, як даўні любы сон,
Цяжка-цяжка размыкае свой палон.

* * *

Падлетак! Вусны горкія твае
І вочы, быццам лёд, што растае,
Брыво тугое надламанай стрэлкай —
Навек у сэрца мне загнаны стрэмкай.

Дзіцёнак... Вечар дыхаў, месяц цвіў;
На ўсё навокал светлы холад ліў.
І кожны з нас струною быў і смыкам,
Уадначас — і скрыпкай, і музыкам...

...Калі ж спатоліліся мы, калі
З угрэтай падымаліся зямлі —
Світала. Ўвачавідкі халадала.
За павароткай восень нас чакала.

* * *

Прыйдзі... Зялёны змрок у пакоі;
Віно ў скляпах не цяплей ад лёду;
Лілеі пахнуць на падваконні,
І мармур дыхае прахалодай.

Вось-вось, згарнуўшы хітон з блакіту,
Зямля пад зорную коўдру ляжа.
Веранда ў доме плюшчом спавіта —
Ніхто не ўбачыць, ніхто не скажа.

А мы ў абдымках цяпло падвоім...
Прыйдзі!.. Чакаю! Бо я не веру,
Што мне й сягоння ізноў з тугою —
З адной тугою! — дзяліць вячэру.

KAMUNIKAT.org

* * *

Перакулены свет.
Родны дом —
Месца,
Дзе адчуваеш сябе
Ашалелай ваверкай
Сярод лясного пажару:
Куды ні паткніся — агонь.
А чужы чалавек —
Той, каго
Да нясцерпнасці хочацца бачыць.
Не каханы,
Не сябра,
Проста — той,
На руках у каго
Звер малы з абгарэлым хвастом
Непрытомна шукае ратунку.

KAMUNIKAT.org

* * *

У вогкай цішыні — ці дворышча, ці лес? —
Бэз абрастае пні. Пні, мабыць, грэюць бэз.

Замкнёная царква. Гнілы раскіслы яр.
На тоненькіх сцяблах пупышкі —
твар у твар.

Як бы ў нямым кіно — чакаюць над сталом
Адзін ад аднаго героі нейкіх слоў.

І словы прагучаць і цішу скалануць.
Ды нам іх не чуваць —
мы дробныя, каб чуць.

* * *

Вільготнай душнай ноччу цяжка спаць
І застаецца толькі ўспамінаць.

Плюскоча задуменна і тужліва
Вада, льючыся, гулкая, з адліва;
І вішаннік, разбухлы, без лісця,
Стае істотай іншага жыцця —
Такі ў сябе заглыблены, старонні...
Каханы, ясны мой, дзе ты сягоння?

Вільготнай душнай ноччу цяжка спаць
І застаецца толькі ўспамінаць.

* * *

Позняй ветранай ноччу,
Паволі,
Забываючы на раскошныя пахі
Зялёнай і мокрай вясны,
Ісці і ўдыхаць
Праз складзеныя далоні
Паветра —
Бо на іх затрымаўся
Пах цела твайго,
Толькі што
Утрапёнага ласкай.

KAMUNIKAT.org

## *Тваё аблічча*

Сухаватыя лініі твару,
Зрослыя бровы над лёдам вачэй —
Лістапад, калі ўсё на зямлі
падабралася, змерзла, падсохла
І толькі азёры
сцюдзёнай жывой глыбінёю
Адлюстроўваюць біты марозам
прыбярэжны чарот і аер.

KAMUNIKAT.org

## *Песня*

Каханы мой вячэраў у доме маім, у сціплым і бедным пакоі; і не зайздросціла я гаспадыні маёй у пышных яе палацах.

Валасы твае пахнуць ветрам, цела тваё пахне хлебам, семя тваё пахне горкай травой палявой.

Сонца ўзыходзіць — залоціць шаты соснаў ды кіпарысаў; сонца сыходзіць — ты са мной застаешся.

Валасы твае пахнуць ветрам, цела тваё пахне хлебам, семя тваё пахне горкай травой палявой.

* * *

Піск, гоман, скокі, вогнішча ўначы —
І ціхі светлы хлопчык пры плячы.
Усенькі час — праз крыкі і пяянне —
Прысутнасці ягонай адчуванне.
Адданасці і прагі повен рух
Празрыстых воч і загарэлых рук.
І кожны міг пасоўвае няўмольна,
Нібыта гайку па разьбе, павольна
Насустрач: мне — яго, яму — мяне...
Нас непазбежнае не абміне:
Ні разгаранне, ні згасанне страсці.
Адно ж было — на самай справе — шчасце:
Піск, крык, пяянне моладзі ўначы —
І незнаёмы хлопчык пры плячы.

* * *

Не ўсё ў разлуцы — ў журбе, бы ў труне.
Не ты — то іншы абдыме мяне.

Ты — спрыт, і сіла, і мускулаў бляск:
Кот, ахаваны багіняю Баст.

А ён — Азірысу любы трыснёг,
Што вырас на скрыжаванні дарог;

І так, як пальцы ягонай рукі,
Трыснёг кранаецца хвалі ракі.

* * *

Ўзяўшы рукі твае, датыкацца губамі запясцяў,
Адчуваць, як пульсуюць пад дотыкам
цёплыя жылкі...
Хай мне скажуць, што гэта часовае,
плыткае шчасце,
Што інакшае ёсць,—
я сваёй не прызнаю памылкі.

Хто калі вызначаў,
што часова, а што пастаянна?
Можа, ў тлуме пякельным
ці ў светласці райскага краю
Не малітваў туту,
не цярпення бясконцага ямы —
А вось гэтыя рукі ды цёплыя жылкі згадаю.

* * *

Няўлоўна змыкаліся захад з усходам; плялася
Нябачная сетка, а колер быў шызы і цёплы.
І цёплаю шызаю сеткай акрылася неба;
Адно — дзе-нідзе пагаралі
падоўжных аблокаў
Пласты; і сціхала гарэнне, і човен заспаны
Сухога, маркотнага белага месяца выплыў.
І ціха ўсё стала,
і плюшч развярнуўся на месяц,
І скруткам распалася ноч...
Я адна была ў хаце.
Святла не паліла, а думала толькі:
мой Божа!
Ты любіш мяне,
дараваўшы вось гэдакі вечар
І думкі аб тым, хто святлейшы
за месяца човен, —
Такі ж беззахісны,
такі ж невяртальна далёкі...

* * *

Снег коле павекі — адліжны:
ільдзісты і рэдкі.
У мружных вачах ліхтары расцвітаюць,
як кветкі.
А сэрца — пустое. Куды жа,
ў што сябе ўкласці.
Каб гэта было — да астанняга позірку —
шчасце?

* * *

Наймільшая з дзяўчат —
Велікавокасць, шчупласць і пяшчота —
Чытае ўголас вершы пра змаганне,
Пра шыбеніцы, пра зямлю і волю.
Граняцца слёзы на яе вачах.
Няздольная кахаць
Спявае пра любоў; няздольны плакаць
Вядзе за ёй пагляд сухі і востры,
Як лазера прамень; а той, хто здатны
І плакаць, і кахаць,— спяваць не можа.
Ён у куце; здушыў далонню рот,
Каб сцяць пакуту, што з яго ірвецца,
Не могучы быць выказанай словам,
А толькі гукам; ды грымас ягоных
Ніхто не разумее:
Усе вакол занятыя сабой.

* * *

Вецер вакол мяне,
Вецер.
І я,
Стоячы на раздарожжы,
Спрабую злавіць яго
Пластыкавым пакетам.
Рукі ледзь могуць трымаць
Празрыстую абалонку —
Нечым напоўненую,
Не пустую.
Але ці вецер у ёй,
Ці паветра?
Так рэчаіснасць
Пакутліва ловіцца ў вершы:
Жыцце там б'ецца
Пад пластыкам блытаных словаў
Ці толькі адбітак ягоны
На гэта імгненне?

* * *

Маці сына й выправаджала,
А месяцам падперазала,
А зораю засцібнула,
А доляю агарнула...
*Вясельная песня*

Як цяжка спалучаць
Пачуцці маці — і любоў жанчыны.
Як цяжка — але толькі не з табой:
Ты і ў каханні застанешся сынам.
Не маці — я цябе падперажу
Халодным срэбным месяцам; і зору,
Як фібулу, замкну пад падбароддзем
(От хораша пяецца ў даўніх песнях!);
І доляй агарну, нібы плашчом:
Нясі старожка чару — не пралі —
Да той, танюткай і доўгавалосай,
Якую згадваў, толькі адступала
Абдымкаў нашых злітнае шаленства.
Дзе хочаш будзь. З кім хочаш будзь. А я
Парадуюся за цябе здалёку —
Бы тая, з песні, што на раздарожжы
Стаіць, страчаючы вясельны поезд.
З іконаю — і з чаркай у руцэ.

* * *

Гэта вясна —
Сонечная, як тваё «здрастуй»,
Зменлівая, як твае вочы —
Шараватыя з іскрай;
Нязграбна-юначая,
Як велікаваты рот.
Пруткая і моцная.
Як худыя хлапечыя плечы
Ў расхлістаным пінжаку.
Ты нагадваеш кожнага з тых.
З кім вярталіся да мяне
Маіх асабістых семнаццаць.
І ў мройнай свядомасці
Сплюшчаных вей
Блытаюся: ці то вецер
Перабірае старыя травы
Колеру тваіх валасоў,
Ці ўздымае твае валасы
Колеру леташніх траваў...

* * *

Такая ноч, што салаўі — крычаць
Адзін аднаму праз глухую цьму.
Такая ноч, што хочацца сказаць:
«Жыццё маё» — усё адно каму.

Спынiся, мiг! Хай у табе iзноў
Склубiцца час, мiнуласць, успамiн —
Каб зноў глушылi крыкi салаўёў
I ў цёплай цемрадзi цялесна млеў язмiн.

## *Анёлы*

Мордачкi, на якiх адбiта
персiкавага колеру нахабства
i дапытлiвасць колеру чорнай вiшнi,
што гняздуе ў бяздонных вачах
пад бясконцымi веямi.

* * *

…вечар без цябе...
…раніца без цябе...
…дзень без цябе...
нібыта цаглінкі
кладуцца ў сцяну
паміж мной і табой

з майго боку сцяны
вось-вось зацвіце алыча
нібы малаком
апырскана лёгкае голле
дыванамі
кладзецца пад ногі трава
і смяюцца вясёлыя людзі
з бутэлькамі піва

з твайго боку сцяны
я не ведаю што
а неўзабаве
магчыма
і не захочацца ведаць
...дзень без цябе...
...ноч без цябе...

* * *

Анёл, у лёце над зямлёю
Згубіўшы галаву,
Упаў, абняўшыся са мною,
У мокрую траву.

Вышыні горняга спакою
Сабой разбіў як шкло, —
І ўпаў, абняўшыся са мною,
Каб мне мякчэй было.

Але і зрынуты з нябёсаў,
Расплюснуты аб дол
Звычайным чалавечым лёсам,
Усё адно — анёл.

* * *

У хваляў сваё жыццё
і сваё ў травы,
У ціхіх каменняў
і гарадскіх галубоў.
І недзе ўглыбі нарастае бунт,
бо жыву
Жыццём чалавека —
а хочацца іх жыцця.

* * *

Бязмоўны вечар. Жоўты далягляд.
Як дрэмлюць на вяроўцы апранахі.
Крывыя вулкі нізкіх шэрых хат.
Высокія сады — вышэй за дахі.

Што віравала — сціхла, прылягло.
Здаецца нават: просіцца у раму
Пры браме куст язміну, і над брамай —
Адзінай зоркі вострае святло.

* * *

Зямля, дзе мяжуюць глыжы і будылле
З крыжамі;
Дзе ржавыя косткі змяшаны з жалезам
Іржавым;
І ўсё гэта сплёты здзічэлых малінаў
Хаваюць ад свету...
Калі Бог і праўда зляпіў мяне з гліны —
То з гэтай.

* * *

Ліпнёвы поўдзень збіў над вербамі
Аблокаў чараду;
І вербы — да адной — абернены
Каскадамі ў ваду.
Празрыстаю галля заслонаю
Шаволяць плыні ўслед...
Зялёная вада, зялёная,
Аблокаў дзіўны квет.

У засені вярбы, пад выгінам,
Чакаўшы, ты стаіш.
А вочы — як у неба выемы,
Як хтось прыдумаў іх:
Глыбокія яны, бяздонныя —
Перакуліўся свет...
Зялёная вада, зялёная,
Аблокаў дзіўны квет.

* * *

А ты мне паклаў на плячо галаву
І стаў гаварыць, што не бачыш жыцця;
Адно бачыш — дымныя вейкі Яе
Ды лёгкія пасмы над гладкім ілбом.

А ўчора ты ружу за шторай схаваў,
Яна ж не звярнула увагі — ані;
А ён Яе мучыць... Ды хто такі ён,
Каб смеў тваю панну
Хоць пальцам крануць?!

А ён... А Яна...
Гавары, гавары.
Я слухаю моўчкі — аб Ёй, аб табе
Ды нават аб ім. Бо галоўнае — што?
Што ты мне паклаў на плячо галаву.

# Змест

*** Стосам блытаных ліній… 5
*** Не кідай, будзь са мной, жыві, пачучце-нежыць… 6
*** Неба лікуе… 6
*** Першая кропля па выпуклым шкле… 7
*** Дзень паўпрылёг на горад і раку… 8
*** Сцежкаю да прыпынку… 8
*** Дымам на веі клеіцца стома… 9
*** Ноч пяе дыханнем тваім… 10
*** Ліпнёвы надвячорак прыкідваецца днём… 10
*** Вечар пахне лісцем і пылам… 11
*** У любой цеплыні на хвіліну здарыцца змрочна… 11
Плён 12
*** Студня на выспе пяску… 13
*** Ты багатай зрабіў мяне… 14
*** Паблякла неба, звітае смутой… 14
*** плыў дождж над горадам… 15
*** Стрыжоў і ластавак мые… 16
*** Я за цябе старэй – на той спакой… 16
*** Ў акне дзявочай спальні… 17
*** Скупое сонца п'юць бакамі гмахі… 18
*** Лянiва, быццам адэсіты, вьш'юць кавы… 19
*** Праполка… 20
*** — Здурнела! Сорам на вачах губляеш!.. 21
*** Май. Дождж ішоў… 22
*** Неба ў бляску сляпучым стыгне… 22
*** На могілках старых з-пад голых вербаў ніцых… 23
*** Холад чаромхі, туману, раскрытае рамы… 24
*** Ліпень. Здымкі начныя… 25
*** Ад мастака – партрэту… 26
*** Сон стане сродкам ізноў, як наяве, ўбачыць… 26
*** Мяне не слухаюцца рыфмы… 27
*** З ціхім шасценнем, бы кнігі старонкі… 27

*** Звечарэла. Сонна ў пакоі… 28
Быў канец лютага 29
*** Жыццё; і ў ім — хрупасткасць і надрыў… 30
*** Хто б сказаў — каханне маё… 31
*** Туман ярам... Плятуцца стужкі туману… 32
*** Неба весняе — ясны німб… 33
*** Цераз якую муку вызнаем… 34
*** А у Цябе няма імя… 34
*** Сёння ў небе імжыцца… 35
*** Апала лісце. Месяц лістапад… 35
*** Над цёплым пылам сходаў… 35
*** Многа зімаў прайшло… 36
*** На сто дарог вакол ляжыць разбухлая зямля… 36
*** Ёсць веліч у старых закінутых мурах… 37
*** А з бяроз — па адным — ападаюць лісты… 37
*** Мокрае, шэрае неба радзімы — ды вочы… 38
*** Лёгкі голас, лёгкі кашаль, лёгка ў такт… 38
*** Падлетак! Вусны горкія твае… 39
*** Прыйдзі... Зялёны змрок у пакоі… 40
*** Перакулены свет… 41
*** У вогкай цішыні… 42
*** Вільготнай душнай ноччу цяжка спаць… 43
*** Позняй ветранай ноччу… 44
Тваё аблічча 45
Песня 46
*** Піск, гоман, скокі, вогнішча ўначы… 47
*** Не ўсё ў разлуцы — ў журбе, бы ў труне… 48
*** Ўзяўшы рукі твае, датыкацца губамі запясцяў… 48
*** Няўлоўна змыкаліся захад з усходам; плялася… 49
*** Снег коле павекі — адліжны: ільдзісты і рэдкі… 49
*** Найменьшая з дзяўчат… 50
*** Вецер вакол мяне… 51
*** Як цяжка спалучаць… 52
*** Гэта вясна… 53
*** Такая ноч, што салаўі — крычаць… 54
Анёлы 54

*** ...вечар без цябе… 55
*** Анёл, у лёце над зямлёю… 56
*** У хваляў сваё жыццё… 56
*** Бязмоўны вечар. Жоўты далягляд… 57
*** Зямля, дзе мяжуюць глыжы і будылле… 57
*** Ліпнёвы поўдзень збіў над вербамі… 58
*** А ты мне паклаў на плячо галаву… 59

KAMUNIKAT.org